ПРАВААБАРОНЦЫ
ЗА СВАБОДНЫЯ ВЫБАРЫ

**Выбары*2024. Аналітычная справаздача аб фармаванні тэрытарыяльных і акруговых выбарчых камісій**

*Экспертная місія па назіранні за выбарамі*2024*[1] *арганізаваная Беларускім Хельсінкскім камітэтам і ПЦ "Вясна" ў межах кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары". Місія збірае і аналізуе інфармацыю аб выбарчай кампаніі па адкрытых крыніцах і паведамленнях ад выбаршчыкаў з Беларусі.*

## ВЫСНОВА

- Фармаванне тэрытарыяльных выбарчых камісій (ТВК) і акруговых выбарчых камісій (АВК), якія з'яўляюцца важным механізмам выбарчага працэсу, пацвердзіла курс на абсалютны кантроль уладамі над усімі этапамі выбараў*2024;
- назіральнікі ў адпаведнасці з абноўленым заканадаўствам не мелі магчымасць прысутнічаць на пасяджэннях органаў, якія ўтваралі ТВК і АВК;
- этап вылучэння ў выбарчыя камісіі суправаджаўся ціскам з боку праваахоўных органаў у выглядзе ператрусаў і праверак у дачыненні да людзей, што праяўлялі актыўнасць падчас папярэдніх электаральных кампаній, што толькі ўмацавала атмасферу страху і з'явілася своеасаблівым сігналам для патэнцыйных удзельнікаў выбарчай кампаніі аб магчымых наступствах прыняцця ўдзелу ў дзейнасці камісій;
- рэзка абмежаванае кола суб'ектаў, якія вылучалі сваіх прадстаўнікоў у склад ТВК і АВК (у выніку рэпрэсій катастрафічна скарацілася колькасць грамадскіх аб'яднанняў; пасля перарэгістрацыі з 16 засталося толькі 4 праўладныя палітычныя партыі);

[1] Для мэтаў дакументаў кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары" тэрмін "выбары*" ў дачыненні да выбарчай кампаніі–2024 выкарыстоўваецца з зорачкай, каб падкрэсліць умоўны характар гэтага тэрміна, бо любая свабодная і справядлівая выбарчая кампанія прадугледжвае, перш за ўсё, умовы, калі ў поўнай меры рэалізуюцца правы і свабоды, уключна з свабодай слова, свабодай мірных сходаў і асацыяцый, правам удзельнічаць у кіраванні сваёй дзяржавай, свабодай ад дыскрымінацыі, што ў цяперашні час у Беларусі практычна адсутнічае.

- большасць прадстаўнікоў у складзе АВК (74,3%) і значная частка — у складзе ТВК (47,1%) вылучаная праўладнымі грамадскімі аб'яднаннямі; 4 палітычныя партыі вылучылі 2,83% прадстаўнікоў у ТВК і 16,3% у АВК;
- слабое інфармаванне выбаршчыкаў аб магчымасці ўзяць удзел у фармаванні выбарчых камісій сведчыць аб незацікаўленасці ўладаў і ключавых суб'ектаў у выглядзе палітычных партый ды іншых грамадскіх аб'яднанняў у актыўным удзеле выбаршчыкаў у дзейнасці выбарчых камісій;
- працэс правядзення пасяджэнняў па фармаванні тэрытарыяльных і акруговых выбарчых камісій характарызаваўся нізкай ступенню адкрытасці і празрыстасці, не забяспечваў дастатковую інфармаванасць грамадзян, быў фармальным і праходзіў пад жорсткім адміністрацыйным кантролем уладаў;
- доля прадстаўнікоў палітычных партый у складзе ТВК і АВК застаецца па-ранейшаму нязначнай (2,9% і 15,6% адпаведна) у параўнанні з доляй прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў (44,5% і 57,8% адпаведна);
- асноўным рэсурсам выканаўцаў, што забяспечваюць правядзенне выбараў*, як і раней, з'яўляюцца пяць найбуйнейшых грамадскіх аб'яднанняў (БРСМ, "Белая Русь"[2], Саюз жанчын, Саюз ветэранаў, Фонд міру) і прафсаюзы, што ўваходзяць у ФПБ, якія маюць (акрамя Фонду міру) з 2023г. заканадаўча замацаваны асаблівы статус набліжанасці да дзяржавы; працэнт праходнасці вылучаных імі прадстаўнікоў у склад камісій складае 98,7% у ТВК і 99% у АВК;
- адміністрацыйны кантроль над фармаваннем камісій і наканаванасць рашэнняў аб зацвярджэнні іх складу пацвярджаюцца суадносінамі вылучаных і абраных членаў: 98,4%;
- ва ўсіх створаных выбарчых камісіях адсутнічаюць прадстаўнікі няпраўладных партый і незалежных грамадскіх аб'яднанняў;
- захоўваецца гендарная дыспрапорцыя: доля жанчын (81,7%) у складзе камісій значна перавышае долю мужчын (18,3%).

## I. ПРАВАВАЯ БАЗА

Падрыхтоўка і правядзенне выбараў забяспечваюцца сістэмай выбарчых камісій[3]. Узначальвае гэтую сістэму Цэнтральная выбарчая камісія (ЦВК),

[2] Тут і далей: існуе Беларуская партыя "Белая Русь" і Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне "Белая Русь". Апошняе з'явілася ініцыятарам стварэння аднайменнай партыі. Больш падрабязная інфармацыя: https://partiya.by/aboutus

[3] Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь, арт. 25. Сістэма камісій па падрыхтоўцы і правядзенні

што з'яўляецца адзінай пастаянна дзеючай з усіх[4]. Падначаленыя ёй камісіі забяспечваюць правядзенне канкрэтнай электаральнай кампаніі і ўтвараюцца пад яе. Парадак утварэння камісій ды іх склад вызначаецца Выбарчым кодэксам.

**Сістэма камісій.** За выключэннем ЦВК, для правядзення выбараў дэпутатаў утвараюцца тэрытарыяльныя, акруговыя і ўчастковыя выбарчыя камісіі[5].

Тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі (ТВК) утвараюцца ў выглядзе абласных, Мінскай гарадской, раённых, гарадскіх (у гарадах абласнога і раённага падпарадкавання), пасялковых і сельскіх выбарчых камісій.

Акрамя тэрытарыяльных выбарчых камісій фармуюцца акруговыя выбарчыя камісіі (АВК) у адпаведнасці з колькасцю членаў ніжняй палаты парламента — 110 дэпутатаў.[6] Адпаведна, у 110 аднамандатных выбарчых акругах павінна быць створана 110 акруговых выбарчых камісій.

На выбарчых участках, куды непасрэдна прыходзяць галасаваць выбаршчыкі, фармуюцца ўчастковыя выбарчыя камісіі (УВК)[7].

**Утварэнне камісій.** ТВК утвараюць прэзідыумы абласных, Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў і абласныя, Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт у складзе 9-13 членаў камісіі.

АВК утвараюць прэзідыумы абласных, Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў і абласных, Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, таксама ў складзе 9-13 членаў камісіі.

УВК утвараюць раённыя, гарадскія выканаўчыя камітэты, а ў гарадах з раённым дзяленнем – мясцовыя адміністрацыі ў складзе, як правіла, 5-19 членаў камісіі. Выбары*2024 дэпутатаў у ніжнюю палату парламента і мясцовыя саветы праводзяцца адначасова, у" адзіны дзень галасавання", а таму ўчастковыя камісіі з'яўляюцца агульнымі па выбарах рознага ўзроўню[8].

**Тэрмін утварэння выбарчых камісій.** Тэрытарыяльныя і акруговыя выбарчыя камісіі, павінны быць утвораны не пазней чым за 75 дзён да выбараў. Участковыя выбарчыя камісіі — не пазней, чым за 30 дзён да выбараў.[9]

---

выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутатаў

4 Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь, арт. 25. Сістэма камісіі па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў, рэфэрэндуму, адклікання дэпутатаў

5 Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь, арт. 28. Выбарчыя камісіі па выбарах дэпутатаў

6 Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, Ст. 91

7 Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь, арт. 28. Выбарчыя камісіі па выбарах дэпутатаў

8 Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь, Ст. 34. Утварэнне камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў, па рэферэндуме, па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата

9 Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь, Ст. 34. Утварэнне камісій па выбарах Прэзідэнта

**Фармаванне складу камісій.** Артыкул 34 Выбарчага кодэкса рэгулюе парадак утварэння камісій па выбарах дэпутатаў.

Камісіі па выбарах фармуюцца з прадстаўнікоў палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, а таксама з прадстаўнікоў грамадзян, вылучаных у склад камісіі шляхам падачы заявы.

Заканадаўствам фармальна прадугледжаны пэўныя нормы, якія павінны забяспечыць палітычны ўдзел грамадства. Так, органы, якія ўтвараюць камісію, як правіла, не менш за адну трацінy яе складу фармуюць з прадстаўнікоў палітычных партый ды іншых грамадскіх аб'яднанняў.[10] У склад камісіі не могуць уваходзіць суддзі, пракуроры, кіраўнікі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.

Выбарчы кодэкс упаўнаважваецца вылучаць па адным прадстаўніку ў склад ТВК наступных суб'ектаў:

- кіруючыя органы арганізацыйных структур палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, зарэгістраваных на тым жа тэрытарыяльным узроўні, дзе ствараецца ТВК;
- працоўныя калектывы арганізацый або калектывы іх структурных падраздзяленняў, якія налічваюць не менш за 10 рабочых і знаходзяцца на тэрыторыі дзейнасці адпаведных ТВК;
- грамадзяне ў колькасці не менш за 10 чалавек, якія валодаюць выбарчым правам і якія пражываюць на тэрыторыі дзейнасці адпаведных ТВК.
- Прадстаўнікоў у склад Мінскай гарадской тэрытарыяльнай выбарчай камісіі маюць права вылучаць:
- кіруючыя органы мінскіх гарадскіх арганізацыйных структур палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў;
- працоўныя калектывы арганізацый або калектывы іх структурных падраздзяленняў, якія налічваюць не менш за 10 супрацоўнікаў і размешчаных на тэрыторыі горада Мінска;
- грамадзяне ў колькасці не менш за 10 чалавек, якія валодаюць выбарчым правам і пражываюць на тэрыторыі горада Мінска.

Такім чынам, вышэйназваныя суб'екты могуць вылучаць сваіх прадстаўнікоў у выбарчыя камісіі толькі па тых тэрыторыях, дзе яны маюць зарэгістраваныя арганізацыйныя структуры.

---

Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў, па рэферэндуме, па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата

[10] Гэта палажэнне не прымяняецца пры фарміраванні ўчастковых камісій, якія ўтвараюцца ў воінскіх частках, месцах часовага знаходжання выбаршчыкаў, удзельнікаў рэферэндуму (у бальніцах, санаторыях, дамах адпачынку і іншых месцах часовага знаходжання).

Сумесныя рашэнні Прэзідыума адпаведнага мясцовага Савета дэпутатаў і выканаўчага камітэта прымаюцца большасцю галасоў складу. У сумесным пасяджэнні гэтых органаў павінны ўдзельнічаць не менш як дзве траціны складу Прэзідыума мясцовага Савета дэпутатаў і выканаўчага камітэта. На пасяджэнні органаў, якія ўтвараюць камісіі, маюць права прысутнічаць прадстаўнікі палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, грамадзян, якія вылучылі сваіх прадстаўнікоў у склад камісіі.

У рашэнні аб утварэнні камісій указваюцца прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца) кожнага члена камісіі, спосаб вылучэння ў склад камісіі, месца знаходжання і нумары тэлефонаў камісіі.

Рашэнне органаў, якія ўтварылі камісію, можа быць абскарджана ў трохдзённы тэрмін з дня яго прыняцця адпаведна ў абласны, Мінскі гарадскі, раённы, гарадскі суд суб'ектамі, якія вылучылі сваіх прадстаўнікоў у склад камісіі. Скарга павінна быць падпісана адпаведна кіраўніком палітычнай партыі (арганізацыйнай структуры), іншага грамадскага аб'яднання (арганізацыйнай структуры), кіраўніком іншай арганізацыі (структурнага падраздзялення), грамадзянамі, якія вылучылі прадстаўніка ў склад камісіі шляхам падачы заявы. Суд разглядае скаргу ў трохдзённы тэрмін, яго рашэнне з'яўляецца канчатковым.

З 16 лютага 2023 г. больш не публікуюцца рашэнні аб фармаванні камісій, замест гэтага ў друкаваных сродках масавай інфармацыі публікуецца толькі паведамленне аб утварэнні камісій не пазней чым праз 7 дзён пасля фармавання камісій.[11] Такім чынам, склад членаў камісіі па імёнах перастаў быць даступным, інфармацыя ёсць толькі аб факце фармавання і агульнай колькасці членаў камісіі. Паведамленне аб утварэнні гарадскіх (гарадоў раённага падпарадкавання), пасялковых, сельскіх камісій у той жа тэрмін можа быць даведзена да ведама грамадзян іншым спосабам, які не канкрэтызуецца заканадаўча.

У адпаведнасці з п. 6 пастановы ЦВК № 36,[12] якія рэгулююць парадак утварэння выбарчых камісій, пры правядзенні пасяджэння органаў, якія ўтвараюць выбарчую камісію, перад прыняццем рашэння аб фармаванні выбарчай камісіі, выносіцца на абмеркаванне пытанне аб дзелавых і асабістых якасцях асоб, вылучаных у склад камісіі, а калі колькасць прэтэндэнтаў у склад выбарчай камісіі перавышае прадугледжаную

---

[11] Змены ў Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь былі ўнесены законам ад 16.02.2023 № 252-З.

[12] Пастанова Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў “Аб тлумачэнні прымянення палажэнняў Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь, якія прадугледжваюць парадак утварэння выбарчых камісій пры правядзенні выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў Рэспублікі Беларусь дваццаць восьмага склікання" ад 15 лістапада 2017 г. № 36

колькасць членаў камісіі, заслухоўваецца інфармацыя па кожнай кандыдатуры і праводзіцца персанальнае галасаванне.

ВК надзяляе правам прысутнічаць на пасяджэнні органаў, якія ўтвараюць выбарчую камісію, прадстаўнікоў палітычных партый ды іншых рэспубліканскіх грамадскіх аб'яднанняў, што павінны быць акрэдытаваны пры ЦВК. Для прысутнасці на пасяджэнні неабходна прад'явіць ліст аб накіраванні прадстаўніка на пасяджэнне (пасяджэнні) органаў, якія ўтвараюць камісіі, выrabленае на бланку палітычнай партыі, іншага рэспубліканскага грамадскага аб'яднання і падпісанае кіраўніком. У новай рэдакцыі ВК назіральнікі былі пазбаўленыя права прысутнічаць на такіх пасяджэннях і знаёміцца з іх рашэннямі.[13]

## II. ВЫЛУЧЭННЕ ПРАДСТАЎНІКОЎ У СКЛАД ТВК і АВК

Вылучэнне прадстаўнікоў у склад АВК і ТВК было праведзена ва ўстаноўленыя тэрміны (не пазней за 5 снежня 2023 г.[14]).

Па дадзеных ЦВК,[15] рознымі суб'ектамі ў склад **110 АВК** вылучана **1 450 чалавек**. У склад **1 284 ТВК** (7 абласных і Мінская гарадская, 118 раённых, 10 гарадскіх у гарадах абласнога падпарадкавання, 14 гарадскіх у гарадах раённага падпарадкавання, 8 пасялковых, 1 127 сельскіх) вылучана **8 164 чалавекі** (супраць 11 167 кандыдатур у склад 1 309 ТВК напярэдадні выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў у 2017 годзе[16]).

Суадносіны суб'ектаў, што вылучаюць для АВК і абласных (уключна з Мінскай гарадской), раённых і гарадскіх (у гарадах абласнога падпарадкавання) камісій падобныя: большая частка прадстаўнікоў (ад 53,6%[17] да 83,1%) вылучана грамадскімі аб'яднаннямі, на другім месцы (ад 13,5% да 33,9%) вылучэнне грамадзянамі шляхам падачы заяваў, меншая частка — працоўнымі калектывамі.

Важна адзначыць, што пераважная колькасць вылучаных кандыдатаў (73,4% для АВК і 47,1% для ТВК) сфармаваная пераважна з прадстаўнікоў чатырох партый, якія прайшлі перарэгістрацыю, і якія прапагандуюць праўладны парадак дня, а таксама пяці традыцыйна актыўных аб'яднанняў з аналагічнай прадзяржаўнай пазіцыяй ("Белая Русь", "Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі", "Беларускі саюз жанчын", "Беларускі фонд міру", "Беларускае

---

[13] Змены ў ВК уведзеныя законам ад 16 лютага 2023 г. № 252-З.
[14] https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/calend-edg.pdf
[15] https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/stat1-2.pdf
[16] https://elections2018.spring96.org/ru/news/88419
[17] Ад агульнай колькасці вылучэнцаў у адпаведныя камісіі

грамадскае аб'яднанне ветэранаў") і прафсаюзаў, якія належаць да праўладнай Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.[18]

Прадстаўнікі ў гарадскія (у гарадах раённага падпарадкавання), пасялковыя і сельскія камісіі вылучаліся, пераважна, грамадзянамі шляхам падачы заяў (ад 44,8% да 49,7%) і грамадскімі аб'яднаннямі (ад 39,6% да 49,0%). Пры гэтым ніводная з чатырох палітычных партый не вылучыла сваіх прадстаўнікоў у камісіі гарадоў раённага падпарадкавання і пасялковыя камісіі.




[18] Пра рэпрэсіі ў дачыненні да незалежных прафсаюзаў гл., сярод іншага, тут: https://www.lawtrend.org/freedom-of-association/situatsiya-so-svobodoj-assotsiatsij-i-organizatsiyami-grazhdanskogo-obshhestva-respubliki-belarus-obzor-za-maj2023-g

## КОЛЬКАСЦЬ ПРАДСТАЎНІКОЎ РОЗНЫХ СУБ'ЕКТАЎ, ВЫЛУЧАНЫХ У СКЛАД ТВК




Інфармацыйнае суправаджэнне дадзенага этапу можна ахарактарызаваць як недастатковае і незбалансаванае: з аднаго боку, праўладныя палітычныя партыі і грамадскія аб'яднанні актыўна ўзаемадзейнічалі з насельніцтвам праз розныя каналы, у першую чаргу, праз сайты мясцовых органаў улады, рэгіянальныя дзяржаўныя СМІ, з іншага — гэтае ўзаемадзеянне не было нацэленае на дэталёвае інфармаванне звычайных грамадзян аб іх правах і магчымасцях. Мерапрыемствы, якія праводзіліся на этапе вылучэння з удзелам згаданых суб'ектаў, публікацыі ў дзяржаўных СМІ, каналах інфармацыі такіх аб'яднанняў не падавалі выбаршчыкам даступную інфармацыю аб тым, як скарыстацца правам удзелу ў дзейнасці АВК і ТВК.

Сайты дзяржаўных органаў альбо фактычна не асвятлялі этап вылучэння прадстаўнікоў, адзначаючы толькі постфактум праведзенае пасяджэнне органаў, якія ўтвараюць камісію,[19] альбо пакідалі кароткую інфармацыю даведачнага характару аб тым, дзе і ў які перыяд ажыццяўляецца прыём дакументаў па вылучэнні прадстаўнікоў у склады камісій — часцяком без згадкі, якія суб'екты і па якой працэдуры могуць вылучаць сваіх

---

[19] Напрыклад, сайт Гомельскага аблвыканкама паведамляе аб маючым адбыцца пасяджэнні нават не ў фармаце навіны з асобным загалоўкам, але ў фармаце анонсу мерапрыемстваў выканаўчых органаў і Саветаў дэпутатаў вобласці на тыдзень: https://gomel-region.by/ru/notice-ru/view/osnovnye-meroprijatijaispolnitelnyx-organov-i-sovetov-deputatov-gomelskoj-oblasti-s-11-po-17-dekabrja-48470-2023/

прадстаўнікоў.[20] Аналагічна дадзены этап асвятляўся ў дзяржаўных СМІ. **Падобнае інфармаванне выбаршчыкаў аб важным этапе выбараў* сведчыць аб незацікаўленасці ўлады і ключавых суб'ектаў у выглядзе палітычных партый ды іншых грамадскіх аб'яднанняў у актыўным удзеле выбаршчыкаў у дзейнасці выбарчых камісій.** Мэтавай аўдыторыяй інфармавання былі пераважна члены палітычных партый, прафсаюзаў ды іншых аб'яднанняў, ад якіх пасля вылучана большасць кандыдатаў.[21] Пры гэтым такія аб'яднанні адкрыта заяўлялі аб намерах накіраваць сваіх прадстаўнікоў для ўдзелу ў дзейнасці камісій усіх узроўняў, наяўнасці адпаведных арганізацыйных рэсурсаў.[22] Падобныя ўмовы ствараюць няроўныя магчымасці ўдзелу ў дзейнасці выбарчых камісій для звычайных грамадзян і членаў адпаведных аб'яднанняў, абумоўліваюць фармаванне камісій з асоб, якія ўжо маюць вопыт падобнай дзейнасці — што пацвярджаецца шматразовымі сцвярджэннямі[23] аб тым, што адным з найважнейшых крытэрыяў пры адборы прадстаўнікоў быў вопыт папярэдняй працы ў камісіі (гл. ніжэй).

З улікам грамадска-палітычнага становішча, уключна з зачысткай палітычнага поля і рэпрэсій ў дачыненні да незалежных грамадскіх аб'яднанняў,[24] кандыдаты, якія не прадстаўляюць ні адну з праўладных партый альбо арганізацый, маглі вылучацца ў камісіі толькі з дапамогай збору подпісаў выбаршчыкаў. Інфармацыя аб вылучэнні такіх асоб адсутнічае; паведамляецца аб адзінкавых выпадках адмовы ў прыёме дакументаў. Акрамя таго, этап вылучэння прадстаўнікоў адзначыўся ціскам у выглядзеператрусаў і праверак праваахоўных органаў у дачыненні да асоб, якія праяўлялі актыўнасць падчас папярэдніх электаральных кампаній, што толькі ўмацавала атмасферу страху для патэнцыйных кандыдатаў і пазбавіла актывістаў магчымасці ўзяць удзел у дзейнасці камісій.[25]

## III. ПАСЯДЖЭННІ ОРГАНАЎ ПА ФАРМАВАННІ КАМІСІЙ

[20] Гл., у прыватнасці, сайт Брэсцкага аблвыканкама https://www.brest-region.gov.by/ru/edg-2024-ru/view/nachat-priem-dokumentov-po-vydvizheniju-predstavitelej-v-sostavy-brestskoj-oblastnoj-izbiratelnoj2000012646 , Гродзенскага аблвыканкама https://region.grodno.by/ru/golosovanije-ru

[21] У якасці прыкладу: https://mosty.grodno-region.by/ru/region-news-ru/view/kruglyj-stol-partijnoestroitelstvo-v-belarusi-politicheskoe-pole-dlja-dejatelnosti-patriotov-proshel-v-24426-2023/

[22] Сярод іншых, прыклад аднаго з пяці актыўных суб'ектаў-грамадскіх аб'яднанняў — "Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі": https://www.belta.by/society/view/brsm-sdelaetaktsent-na-povyshenii-elektoralnoj-aktivnosti-molodezhi-600950-2023/

[23] https://mogilev-region.gov.by/news/pervoe-zasedanie-oblastnoy-izbiratelnoy-komissii-po-vyboramdeputatov-proshlo-v-mogileve ; https://www.brest-region.gov.by/ru/news-ru/view/brestskaja-oblastnaja-ibolshinstvo-okruzhnyx-izbirkomov-sformirovany-v-maksimalnom-sostave-2000012887-2023

[24] Гл. «Сітуацыя напярэдадні выбараў*2024. Першая справаздача кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары"»: https://elections2024.spring96.org/be/news/113485

[25] https://elections2024.spring96.org/be/news/113565

Не пазней за 11 снежня 2023 года, згодна з каляндарным планам, прэзідыумы Саветаў дэпутатаў і выканаўчыя камітэты павінны былі сфармаваць (утварыць) склад ТВК і АВК.

Кампанія "Праваабаронцы за свабодныя выбары" адзначае адміністрацыйны ціск на дзеянні і рашэнні сходаў, якімі фармуюцца камісіі. Сходы па фармаванні камісій часта мелі фіктыўны і фармальны характар, без рэальнага абмеркавання і ацэнкі кандыдатаў у сябры камісій, што пацвярджаецца амаль стоадсоткавым (98,4%) супадзеннем спісаў вылучаных кандыдатаў і абраных сябраў камісій.

У некаторых выпадках прадстаўнікі мясцовых органаў кіравання прысутнічалі на пасяджэннях па фармаванні камісій у сумешчаным (афлайн і анлайн) фармаце. Такі фармат, з аднаго боку, забяспечвае больш шырокія магчымасці ўдзелу, але, з іншага боку, можа выкарыстоўвацца як інструмент скарачэння актыўнасці абмеркавання і ўцягнутасці ў прыняцце рашэння. Напрыклад, пры фармаванні Брэсцкай абласной і акруговай камісіі большасць удзельнікаў пасяджэння прысутнічала анлайн. Паведамляецца, што гэта негатыўна адбівалася на ўцягнутасці ўдзельнікаў сходу і ўзмацняла яго фармальны характар.

Узровень даступнасці інфармацыі аб працэсе фармавання камісій, як і ўзровень транспарэнтнасці працэдуры ў цэлым, варта ахарактарызаваць як нізкі. У многіх выпадках на сайтах мясцовых органаў улады, адказных за фармаванне камісій, не было даступнай і зразумелай інфармацыі аб працэдуры правядзення і ўдзельніках пасяджэнняў, аб прынятых на іх рашэннях.

Пайменны склад пасяджэнняў мясцовых органаў улады, якія ажыццяўляюць фармаванне выбарчых камісій, не публікаваўся і не быў даступны.

Вядомы шэраг выпадкаў, калі інфармацыя аб правядзенні пасяджэння мясцовых органаў кіравання па ўтварэнні выбарчых камісій не была апублікаваная.

У астатніх выпадках публікацыя інфармацыі аб месцы і часе правядзення пасяджэнняў па фарміраванні камісій на сайтах мясцовых выканаўчых камітэтаў хутчэй насіла характар выканання фармальнасці, чым была сапраўды накіраваная на прыцягненне ўвагі грамадзян. Напрыклад, на сайце Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта інфармацыя аб правядзенні пасяджэння па фармаванні выбарчых камісій не была вынесеная на галоўную старонку сайта і не была ўключаная ў абноўлены раздзел "Актуальная інфармацыя".

Нягледзячы на тое, што асвятленне выбарчай кампаніі праводзіцца не толькі ў агульнадзяржаўных, але паралельна і ў рэгіянальных дзяржаўных СМІ (прысутнічае айдэнтыка "Адзіны дзень галасавання"), інфарматыўнае напаўненне аб ходзе фарміравання выбарчых камісій даволі беднае. У некаторых выпадках наогул адсутнічала інфармацыя пра дату, час і месца пасяджэння.

Так, напрыклад, інфармацыя аб правядзенні сходаў, на якіх былі сфармаваныя Гродзенская абласная выбарчая камісія і акруговыя выбарчыя камісій па Гродзенскай вобласці (выбарчыя акругі № 48-60) не паведамлялася ні на сайце мясцовага дзяржаўнага СМІ "Гродзенская праўда", ні на мясцовым дзяржаўным тэлеканале "БТ 4 Гродна".[26] Дадзеная інфармацыя таксама адсутнічала на сайтах 5 з 18 органаў мясцовай улады ў Гродзенскай вобласці (Ваўкавыскага, Зэльвенскага, Іўеўскага, Карэліцкага і Лідскага раёнаў).[27]

Доступ да працэсу фармавання выбарчых камісій у прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці і грамадзян быў практычна закрыты. Няма інфармацыі аб правядзенні анлайн-трансляцый пасяджэнняў, таксама не былі забяспечаныя магчымасці для прысутнасці недзяржаўных СМІ. Акрамя таго, на заканадаўчым узроўні назіральнікі былі пазбаўленыя магчымасці адсочваць гэтую працэдуру. Паведамляецца, што пры фармаванні выбарчых камісій у адным выпадку прадстаўніку адзінага не праўладнага кандыдата ў члены камісіі было адмоўлена ў магчымасці прысутнічаць на пасяджэнні на падставе таго, што яго пакет дакументаў не быў прыняты.

Доступ да рашэнняў, прынятых па выніках пасяджэнняў мясцовых органаў улады па фарміраванні выбарчых камісій, таксама абмежаваны. Апошнія змены ВК[28] прыбралі неабходнасць апублікавання пайменных спісаў членаў выбарчых камісій, таму інфармацыя аб складах камісій публікуецца ў выглядзе ананімізаванай статытстыкі. Аднак назіраюцца складанасці з доступам нават да інфармацыі аб рашэнні пасяджэнняў органаў, якія фарміруюць выбарчыя камісіі.

---

[26] Навіны па тэме выбараў* 2024 на сайце "Гарадзенскай праўды" даступныя па спасылцы: https://grodnonews.by/vybory.php
Відэазапісы навінавых эфіраў тэлеканала "БТ 4 Гродна" даступныя па спасылцы: https://www.tvgrodno.by/news/

[27] Апублікаваная інфармацыя па тэме выбараў* 2024 на сайтах
Ваўкавыскага райвыканкама: https://volkovysk.grodno-region.by/ru/vybory2024-ru Зэльвенскага: https://zelva.grodno-region.by/ru/vibory_2024-ru Іўеўскага: https://www.ivje.gov.by/ru/vybory2024-ru Карэліцкага: https://korelichi.gov.by/ru/vybory-2024-ru Лідскага: https://lida.gov.by/ru/edinyj-dengolosovanija-ru

[28] Змены ў ВК уведзеныя законам ад 16 лютага 2023 г. № 252-З. Таксама гл. https://elections2024.spring96.org/ru/news/113581

**Такім чынам, працэс правядзення пасяджэнняў па фармаванні тэрытарыяльных і акруговых выбарчых камісій характарызаваўся нізкай ступенню адкрытасці і празрыстасці, не забяспечваў дастатковую інфармаванасць грамадзян, быў фармальным і праходзіў пад жорсткім адміністрацыйным кантролем уладаў.**

## IV. СКЛАД УТВОРАНЫХ ТВК і АВК

Усяго сфармавана 1 394 тэрытарыяльных і акруговых выбарчых камісій, у склад якіх абралі 9 459[29] чалавек, або 98,4% ад вылучаных кандыдатаў, што пацвярджае адміністрацыйны кантроль і наканаванасць рашэнняў аб фармаванні камісій

Назіраецца сур'ёзная гендарная дыспрапорцыя: доля жанчын (81,7%) у складзе камісій значна перавышае долю мужчын (18,3%). Гэта пацвярджае сістэмныя тэндэнцыі ў Беларусі: жанчыны з'яўляюцца асноўнымі выканаўцамі ў кіраўнічым апараце на абласным і мясцовым узроўні.[30]

---

[29] https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/stat3-4.pdf

[30] Доля жанчын-дзяржаўных служачых - 70,1% http://gender.belstat.gov.by/social/162?type=columnChart&reg = (F): (T): (T); доля жанчын сярод кіраўнікоў сельскіх, пасялковых і гарадскіх (гарадоў раённага падпарадкавання) выканаўчых камітэтаў і іх намеснікаў - 69,7% http://gender.belstat.gov.by/social/163?type=pieChart2&reg = (F); жанчыны значна апярэджваюць мужчын па ўзроўні адукацыі: http://gender.belstat.gov.by/education/121?type=pieChart2&reg = (T/F/M):(T):(HE):(T)

## ГЕНДАРНАЯ ПРАПОРЦЫЯ СЯБРАЎ АВК І ТВК




Уключаныя ў склад камісій прадстаўнікі палітычных партый – 4,8%, іншых грамадскіх аб'яднанняў – 46,5%, працоўных калектываў – 7%, грамадзян – 41,8%.




Доля прадстаўнікоў палітычных партый у складзе ТВК і АВК застаецца невысокай – 451 чалавек, або 4,8% ад усіх вылучаных – у параўнанні з доляй прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў – 4 395 чалавек, або 46,5%.

Так як усе апазіцыйныя палітычныя партыі ліквідаваныя[31] – у ТВК і АВК увайшлі толькі прадстаўнікі праўладных палітычных партый.

201 з 451 прадстаўніка партый (2,1% ад агульнага складу выбарчых камісій і 44% ад усіх палітычных партый) – сябры Беларускай партыі "Белая Русь", якая зарэгістраваная рашэннем Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь 2 мая 2023 года.[32]

Большасць членаў ТВК і АВК традыцыйна прадстаўлены сябрамі найбуйнейшых праўрадавых грамадскіх аб'яднанняў: Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі (БРСМ), Белая Русь, Беларускі саюз жанчын, Беларускі фонд міру, Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў, прафесійныя саюзы, якія ўваходзяць у ФПБ. Усе гэтыя пяць грамадскіх аб'яднанняў (акрамя Фонду міру) у адпаведнасці з новым законам "Аб асновах грамадзянскай супольнасці" аднесены рашэннем Міністэрства

[31] https://spring96.org/be/news/112957
[32] https://minjust.gov.by/press/news/politicheskie_partii_obshchestvennye_obedineniya_i_drugie_nekommerchekie_organizatsii/v_belarusi_sozdana_novaya_politicheskaya_partiya/?sphrase_id=355766

юстыцыі[33] да суб'ектаў грамадзянскай супольнасці, "якія маюць права на ўзаемадзеянне з дзяржаўнымі органамі (арганізацыямі) у асаблівых формах", г. зн. іх залежнасць ад дзяржавы замацаваная заканадаўча.

## A. Склад АВК

У склад 110 АВК абраныя 1 414[34] чалавек, або 97,5% ад вылучаных. Вылучана ў склад камісій 1 450 прадстаўнікоў.[35] Гэта азначае, што АВК сфарміраваны ў максімальна магчымым колькасным складзе.[36]

Для параўнання, на папярэдніх выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання (2019 год), было абрана 1 430 чалавек, або 73% ад вылучаных.[37]

У склад АВК уключаныя прадстаўнікі:

а) грамадзян – 337 чалавек (23,8% ад складу АВК).

*На выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання 2019 года, у склад АВК увайшлі 494 чалавекі (34,5% ад складу АВК).*

б) працоўных калектываў – 39 чалавек (2,8% ад складу АВК)

в) палітычных партый – 221 чалавек (15,6% ад складу АВК)

*96 з 221 прадстаўніка партый (43,4%) – сябры Беларускай партыі "Белая Русь". Другое месца займае Камуністычная партыя Беларусі – 61 чалавек (4,3% ад складу АВК). На выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання 2019 года, найбольшы працэнт – 4,8% ад складу АВК[38] – прадстаўнікоў у склад АВК увайшоў ад Камуністычнай партыі Беларусі.*

г) іншых грамадскіх аб'яднанняў – 817 чалавек (57,8% ад складу АВК)

*Большую частку членаў АВК склалі прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў – 817 чалавек ці 57,8%.*

[33] https://minjust.gov.by/directions/compare_coverage/
[34] https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/stat3-4.pdf
[35] https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/stat1-2.pdf
[36] абзац 3 частка 1 арт. 34 Выбарчага кодэкса https://etalonline.by/document/?regnum=hk0000370
[37] https://elections2019.spring96.org/ru/news/93944
[38] https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/stat4.pdf




У АВК уключаны 99% (766 чалавек, або 54,2% ад агульнага складу АВК) прадстаўнікоў пяці праўладных грамадскіх аб'яднанняў і прафсаюзаў ад агульнай колькасці вылучаных гэтымі суб'ектамі:

- Белая Русь – 103 чалавекі (7,3% ад складу АВК)
- Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі – 103 чалавекі (7,3% ад складу АВК)
- Беларускі саюз жанчын – 103 чалавекі (7,3% ад складу АВК)
- Беларускі фонд міру – 66 чалавек (4,7% ад складу АВК)
- Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў – 91 чалавек (6,4% ад складу АВК)
- прафесійныя саюзы, якія ўваходзяць у ФПБ – 300 чалавек (21,2% ад складу АВК)

## Б. Склад ТВК

Усяго сфарміравана 1 284 ТВК,[39] у якія ўвайшлі 8 045 чальцоў, з іх:

- 230 прадстаўнікоў палітычных партый (2,9% ад агульнай колькасці).

[39] https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/stat3-4.pdf

*105 з 230 прадстаўнікоў партый (45,7%) – сябры Беларускай партыі «Белая Русь». На рэспубліканскім рэферэндуме па пытанні ўнясення змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь 2022 года, 80 з 89 прадстаўнікоў партый (90%) — члены Камуністычнай партыі Беларусі,[40] якія на прэзідэнцкіх выбарах 2020 года складалі 58% ад членаў тэрытарыяльных камісій, вылучаных партыямі.*

- 3 578 прадстаўнікоў іншых грамадскіх аб'яднанняў і прафсаюзаў ФПБ, склалі большую частку членаў ТВК, а менавіта 44,5% ад усяго складу камісій.

*У ТВК уключаны 98,7% прадстаўнікоў пяці праўладных грамадскіх аб'яднанняў і прафсаюзаў ад агульнай колькасці вылучаных гэтымі суб'ектамі.*

- 3 616 чалавек прадстаўляюць групы грамадзян (44,9% ад агульнай колькасці),
- 621 – працоўныя калектывы (7,7% ад агульнай колькасці).




---

[40] https://referendum2022.spring96.org/ru/news/106539